УДК 811.161.3’367

# СІНТАКСІЧНЫЯ ФІГУРЫ ЯК СРОДКІ СТВАРЭННЯ ЭКСПРЭСІЎНАСЦІ Ў ТЭКСЦЕ

***К. А. Сцефаненка*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

Пад экспрэсіўнасцю тэксту звычайна разумеецца такая ўласцівасць тэксту або яго часткі, якая перадае сэнс з узмоцненай інтэнсіўнасцю, выражаючы ўнутраны стан гаворачага, і мае вынікам эмацыянальнае або лагічнае ўзмацненне. Як адзначае В.А. Маслава, асноўнай функцыяй экспрэсіўнасці з’яўляецца “ўзмацненне ўздзеяння на інтэлектуальную, эмацыянальную і валявую сферы асобы рэцыпіента” [1, с. 12].

Экспрэсіўнае ў мове выступае як нерэгулярнае, нетыповае, і таму незвычайнае, выразнае, паколькі экспрэсіўнасць – паняцце камунікатыўна-функцыянальнае, маўленчае, яна вызначаецца сваёй прагматычнасцю, накіраванасцю на адрасата, валодае функцыяй уздзеяння. У аснове экспрэсіі ляжыць свядомая неадпаведнасць якіх-небудзь моўных або маўленчых сродкаў моўным стандартам, гэта значыць рэгулярным, устойлівым мадэлям. Такім чынам, чым большае адрозненне экспрэсіўнай канструкцыі ад нормы мовы, тым большая верагоднасць, што гэта сінтаксічная канструкцыя будзе ўспрынята рэцыпіентам менавіта як экспрэсіўная.

У сучасным сінтаксісе вывучэнне экспрэсіўнасці адбываецца ў двух напрамках: першы звязаны з паняццем мадальнасці (тэрмін Н.Ю. Шведавай – “экспрэсіўна-мадальныя значэнне”), другі – з імем В.У. Вінаградава, у працах якога суб’ектыўна-экспрэсіўныя формы сінтаксісу выступаюць як сродкі экспрэсіўнай выразнасці. Экспрэсіўнымі канструкцыі становяцца толькі пры наяўнасці адпаведнага стылістычнага эфекту. Сярод экспрэсіўных фігур традыцыйна выдзяляюцца сінтаксічны паралелізм, градацыя, эліпсіс, полісіндэтон, інверсія, парцэляцыя, стык, рытарычны зварот, хіязм і інш. У мастацкім творы сінтаксічныя фігуры нясуць эстэтычную функцыю, удзельнічаюць разам з іншымі прыёмамі моўнай экспрэсіі ў стварэнні мастацкіх вобразаў. Беларуская мова дазваляе аўтарам свабодна размяшчаць словы ў пэўным парадку, што надае гнуткаці тэксту, а гэта, у сваю чаргу, спрыяе стварэнню разнастайных сродкаў мастацкай выразнасці.

**Літаратура**

1. **Маслова, В. А.** Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста : учеб. пособие / В. А. Маслова. – Мінск : Вышэйшая школа, 1997. – 156 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова